Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 44 (543). Вільня, Нядзеля 10 Сьнежня 1933 г. Год IX (XVII)

Беларуская
КРЫНІЦА
Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, Завальная вул. 1-1. (Wilno, ul. Zawalna 1-1).
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел. КРЫНІЦА“ каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

S. M. P.

Моладзь — гэта будучыня. Ня дзіва, такім чынам, што кожнае грамадзянства заўсёды на моладзь зварочвае асаблівую ўвагу. Ня йнакш паступаюць і польскія палітыкі на беларускіх землях, што ўвайшлі ў склад Польскай Рэспублікі. Палітыкі гэтыя добра разумеюць, што калі ім удасца спольшчыць беларускую моладзь, то гэтым самым удасца ім у вялікай меры спольшчыць і народ беларускі.

Вось-жа дзеля полёнізацыйных мэтаў палякі паставілі на ногі на нашых землях аж некалькі польскіх арганізацыяў моладзі. Спатыкаем там „Związek Młodzieży Wiejskiej“, арганізацыю „Strzelca“ і „Stowarzyszenie Młodzieży Polskiej“ ці коратка — S. M. P. Дзьве першыя арганізацыі агулам і працуюць і пашыраюцца слабей, а трэцяя даволі значна.

S.M.P. — гэта тыповая польская нацыяналістычная арганізацыя. Паўстала яна ў Пазнаншчыне, адкуль на нашыя землі прывёз яе польскі арцыб. Ялбжыкоўскі і якую, пры помачы Касьцёла і ксяндзоў, пачаў тут шырока арганізаваць і пашыраць.

S.M.P. да апошняга часу налічае на беларускіх землях да 40 тысяч сяброў. Лічба гэта, як бачым, даволі значная і, калі-б яна выражала ідэовую моладзь, дык S.M.P. была-б сапраўды для палякоў карыснай, а для беларусаў грознай сілай. Але на шчасьце для нас ідэовае і маральнае аблічча гэтай арганізацыі ня высокае.

Працу ў S.M.P. праводзяць, як мы ўжо сказалі, польскія ксяндзы па загаду арцыбіскупа, а так-жа і нанятыя імі агітатары. Цягнуць яны да сябе прадусім каталікоў, але ня брыдзяцца, дзе дасца, і праваслаўнымі. Каталікі ідуць у гэту арганізацыю дзеля розных прычын: адны затым, што S.M.P. — дзеля сваей нясьведамасьці — лічаць арганізацыяй каталіцкай, другія затым, што ня хочаць абрыджацца з сваім пробашчам, трэція затым, што хочуць у S.M.P. паскакаць на вечарынах і пры аказіі выпіць, іншыя ўзноў затым, што хочуць дарма летам паехаць на дажынкі да Прэзыдэнта, дзяўчаты — каб насіць рагатую шапачку і каб хутчэй знайсьці сабе мужа, а ўрэшце праваслаўныя — хоць дужа ў малым ліку — дзеля кумпаніі з сваімі таварышамі каталікамі, ну й часта тыя, якія дзеля розных асабістых мэтаў хочуць быць палякамі больш чым самі палякі.

Прычыны, дзеля якіх наша моладзь трапляе ў S.M.P., гавораць дастатачна, як аб ідэовым, так і агулам маральным боку гэтай арганізацыі. І сапраўды—практыка паказвае, што моладзь з гэтай арганізацыі духова і культурна агулам стаіць даволі нізка. Гэта агульнае зьявішча, на якое чуем нараканьні з усіх старонак нашага краю. Ды інакш і быць ня можа. Моладзь можа гадаваць і разьвіваць толькі сапраўды вялікая і жывая ідэя, а ў S.M.P. гэтага якраз і ня бачым.

Праўда, каталіцтва, на якім быццам апіраецца S.M.P., магло-б даць моладзі многа добрага, калі-б яно там было, але там каталіцтвам завецца звычайны польскі чорнасоценны нацыяналізм, які адзеўшы для формы хрысьціянскую тогу, жарлочна пажырае беларусаў

Узноў-жа таксама праўда, што польская нацыянальная ідэя так-жа шмат магла-б даць добрага моладзі, але моладзі толькі польскай, а не беларускай і пры тым тады, калі-б польскі народ быў дагэтуль паднявольны і імкнуўся да волі. Тымчасам польскі народ ужо вольны і раздуваньне вузкага нацыяналізму, хоць-бы і сярод польскай моладзі, сяньня ўжо ей некарысна, але шкодна. Сяньня для польскай моладзі было-б дужа карысным разьвіваць у сабе ідэалы грамадзкай справядлівасьці і імкнуцца да гармонійнага сужыцьця народаў і дзяржаваў. Усяго гэтага у S.M.P. няма і званьня, а да таго там на беларускіх землях і моладзь у вялізарнай сваей большасьці беларуская, дык ня дзіва, што і вынікі працы S.M.P. нікудышныя. S.M.P. дае нашай моладзі не ўзгадаваньне і культурны развой, а заняпад і звычайне здэмаралізаваньне.

Вывад з усяго сказанага для нашай моладзі сам напрашаецца.

Да працы і змаганьня!

У стацьці „Жыцьцё пераможа!“ (Бел. Крыніца“ № 36—1933), веручы ў перамогу жыцьця над штучнымі тэорыямі камунізму, даказваецца, што паход у БСРР. на Беларускі Народ з пункту гледжаньня бальшавіцкіх дактрын правільны і што гэтага паходу Масква не распачала раней толькі дзеля нутраных і вонкавых прычын. Ня будзем цяпер гэтага паўтараць, бо хочам сказаць аб другім—аб тых рэфлексіях, якія паўстаюць пасьля гэтага артыкулу.

Беларускаму Народу, асабліва селяніну, які корчыцца пад ботам маскаля, не да тэорыяў, у імя якіх яго душаць і не даюць жыць. Ён не патрабуець дашуківацца прычын „курсу выпраставаньня лініі і ўзгадненьня нацыянальнай бальшавіцкай палітыкі адносна Беларусоў“. Ён ведаець, што ад самага пачатку маскоўскі бальшавізм пануе на Беларусі. Ці душаць цяпер маскоўскія цэнтралістыя апранутыя ў камуністычную вопратку і прыкрываючыся тэорыямі Леніна, ці душыла ўсякую праяву нацыянальнага адраджэнскага руху царская Расея, прыкрываючаяся тэорыямі Столыпіна —палажэньне нашага народу не мяняецца. Што бальшавікі, кіруючыя Расеяй, у сваей імпэрыялістычна-хіжацкае палітыцы нічога новага не прыдумалі,—хіба ведама кожнаму дасьведчанаму чалавеку. Яны йдуць па лініі, якая даўна расьцярэблена царскімі палітыкамі і дыплёматамі. Лінія-ж гэта вяла й вядзець да імпэрыялізму і вялікадзяржаўнасьці. Калі чорнасоценныя Сталыпіны ўглядалі ў праявах нацыянальных рухаў крамолу, тое самае ўглядаюць цяперашнія камуністычныя ўладары Расеі, называючы гэтыя рухі ўжо не „крамолай,“ а „контр-рэвалюцыяй.» Палітыка-ж адносна беларусоў і другіх народаў узгоджана ў Маскве ад самага пачатку панаваньня бальшавікоў над Беларусьсю. Найлепшым прыкладам гэтага ўзгоджаньня, яшчэ сьвежага ў памяці нас жывучых учасьнікаў Ўсебеларускага Кангрэсу ў Менску,—аружны разгон гэнага Кангрэсу Мясьніковымі і Крывашэінамі, хаця рэзалюцыі, прынятыя Кангрэсам у сацыяльных пытаньнях — ніколькі не пярэчылі вымогам гаротнага беларускага сялянства; аднак прыказана было п'янюзе тав. Крывашэіну разагнаць Усебеларускі Кангрэс, аб'явіўшы яго контр-рэвалюцыйным, бо Маскве йшло не аб што іншае, як аб уладаньне Беларусьсю.

Калі маскоўскі бальшавізм імкнецца злучыць людзей усіх нацыянальнасьцяў, прадусім людзей незадаволеных з эканамічнага палажэньня,—як кажыць аўтар стацьці грам. Я—іч, — дык мусіма дабавіць, што маскоўскія бальшавікі, каб аслабіць імпэрыялістычную Англію, гэтак шкодзіўшую царскае Расеі і шкодзячую й цяперашнім уладарам Расеі — перш за ўсё падтрымліваюць—больш таго—паглыбляюць нацыянальны індускі вызваленчы рух. Тое самае рабіла царская Расея на Балканах і ў Аўстра-Вэнгрыі, „бароначая“ тамака славянаў, распальваючы ненавісьць да Турцыі і Аўстра-Вэнгрыі.Ці-ж зацікаўленьне маскоўскіх бальшавікоў вызваленчым рухам у Індыі й апека царскае Расеі славянамі на Балканах былі чыста бескарысныя—платанічныя, ці ня робіцца гэта й нерабілася дзеля іхных грубых карысьцяў?—Разумеецца, што так, бо дыплёматычныя шляхі царскіх міністраў і бальшавіцкіх камісараў тыя самыя.

А цяпер аб самым глаўным, — аб тае веры, што жыцьцё мацней усяго і бальшавіком ня ўдасца нагнуць жыцьця Беларускага Народу да вымогаў сваей навукі. Верыць трэба, але адначасна трэба памятваць, што вера бяз чыну мёртва. Павінна быць ведама аб тым, што злажыўшы рукі і пасыўна аддаючыся цячаі жыцьця, хутчэй дапаможама адбываючамуся працэсу ністажэньня беларускае Нацыі. У гэта вераць нашыя ворагі, не пасыўна адносячыся да справы, а цьвёрда й рашуча праводзячы ністажэньне ўсяго, што зьвязана з паняцьцем беларускае нацыі. І — як нам ня горка й балюча — а трэба прызнаць, што актыўная барацьба нашых ворагаў даець ім пажаданыя вынікі: тысячы беларускіх рэнэгатаў працуюць сёньня на карысьць Масквы й Варшавы, моладзь нашая пхнецца у польскія і бальшавіцкія арганізацыі, выракаючыся свайго нацыянальнага, роднага. Сялянства, забітае бядой і голадам, зьбянтэжанае і запужанае, моўчкі пераносіць усе злыбеды шэрых днёў, чакаючы нейкіх перамен, нейкага прасьвету ў ягоным шэрым жыцьці. І ў гэтыя жорсткія часы, якія перажываець наш народ, чуема пацеху: неяк будзе, жыцьцё пераможыць! У гэтым „неяк будзе» — у тыпова славянскім і талстоеўскім непраціўленьню злу—крыецца трагэдыя нашага Народу, давёўшая яго да таго палажэньня, у якім ён сёньня апынуўся. Зацёрліся ў Ім традыцыі слаўнае мінуўшчыны незалежнага бытаваньня, пагас дух вольнасьці й дух барацьбы за вольнае жыцьцё. Чужынцы Яго крыўдзяць, свае памагаюць бядаваць. З гэтае трагічнае пасыўнасьці нашага Народу, з Ягонае веры, што нешта й нехта паправіць Ягоную долю, вякамі карысталі захад і ўсход, разьдзіраючы Яго землі і палонячы душу.

Не плачамі і бядаваньнямі палепшыць беларускі Народ сваю долю, ня вераю, што жыцьцё пераможыць злое, а толькі актыўнае змаганьне забязьпечыць лепшую будучыю і да гэтага змаганьня трэ' прызваць Беларускі Народ!

Антон Паддубіч.

Сьв. П.

Пятро Пяршукевіч

студэнт IV-га курсу матэматычна-прыродазнаўчага факультэту Віленскага Унівэрсытэту, сябра Беларускага Студэнскага Саюзу, — па цяжкой хваробе памёр у Сэйміковым шпіталі ў Наваградку дня 4-га сьнежня с. г., маючы гадоў 23, — аб чым падаюць да ведама огулу беларускага студэнства і грамадзянства а так-жа выражаюць свой шчыры спогад Бацькам і Радні Нябожчыка

Сябры Бел. Студ. Саюзу.

Адкрыцьцё Археолёгічнага Музэю.

У панядзелак 4.XII.33 г. адбылося ўрачыстае адкрыцьцё Археолёгічнага Музэю Віленскага Унівэрсытэту. На ўрачыстасьці гэнай быў прысутным ведамы польскі вучоны—прэгісторык праф. Антоневіч. У зьвязку з гэтым Кола Прэгісторыкаў зладзіла ў вечары гарбатку, падчас каторай забіралі голас рэктар Унівэрсытэту праф. Станевіч, дзекан праф. Отрэмбскі, праф. Антоневіч і інш. Праф. Антоневіч заклікаў прысутных да падтрыманьня прэгістарычных працаў на нашых землях, зазначаючы, што гэтыя землі хаваюць у сабе шмат цікавага матэрыялу. Праф. Антоневіч адначасна папярэдзіў, каб у працах прэгістарычных ня йсьці сьлядамі шавінізму і не дашуківацца тут быцьця палякоў у сівой мінуўшчыне, бо іх тут ніколі ня было.

Цікава адзначыць, што нядаўна раскапаная на гары Бэкішовай сяліба з XIII в. перахавала розныя памяткі тых часоў, якія паводле праф. Антоневіча зьяўляюцца сьвядоцтвам таго, **што на гэтых землях ужо ў XIII в. жылі Беларусы.**

З ГАЗЭТ.

Гляньце глыбей!

«Воскресное Чтение» у № 46 47 напісала, што „Б.Крыніца"—гэта быццам толькі „орган белорусской католической христіанской демократіи." На гэтай падставе нашай газэце закідываецца ў „Воскр. Чтеніи" тэндэнцыйнасьць у тых выпадках, калі яна піша аб справах праваслаўнай Царквы.

Бязумоўна, усё вышэй сказанае мінаецца з праўдай. „Бел. Крыніца" зьяўляецца органам «Беларускай Хрысьціянскай Дэмакратыі," якая ў свае рады ўвабірае і праваслаўных і каталікоў. Гэты пункт 5 гадоў таму назад якраз і паслужыў віленскаму польскаму р.-кат. арцыб. Ялбжыкоўскаму за прычыну забароны належаць да Б.Х.Д. беларусом-каталіком, чаго, натуральна, ніхто не паслухаў. У прэзыдыюм Ц.К.Б.Х.Д. уваходзяць як віцэ-старшыні грам. грам. Мікалай Дварэцкі і Яхім Красоўскі — абодва праваслаўныя. Таксама і сярод звычайных сяброў партыі значная частка — гэта праваслаўныя. Ужо гэта гаворыць, што «Бел. Крын." тэндэнцыйнай быць ня можа. Іншыя пастаўленыя нам закіды не зьяўляюцца закідамі рэчовымі, а звычайным палемічным выбегам. Адносна дамаганьняў каталікоў беларускае мовы ў Касьцеле, то радзімо рэдактаром „Воскр. Чтенія" прагледзіць гадавікі „Бел. Крыніцы," або даведацца хоць-бы аб справе Жодзішак.

З беларускага жыцьця.

Сьмерць сябры Б.С.С. Сябры Беларускага Студэнскага Саюзу ў Вільні дня 4-га г. м. атрымалі сумную з правінцыі вестку: **памёр сябра Пятро Пяршукевіч**, які дзеля матэр'яльных прычын мусіў у сёлетнім акадэміцкім годзе прыпыніць навуку на ўнівэрсытэце і аставацца ў хаце. Вестка гэтая зрабіла на сяброў сільнае прыгнечаньне. Студэнства балюча адчула страту дарагога свайго калегі.

Нябожчык Пятро Пяршукевіч — гэта адзін з тых студэнтаў, якіх творчы запал да працы ў справе адраджэньня свайго народу ніколі ня спыняўся. Яго бадзёрасьць і актыўнасьць — можа служыць для насьледаваньня іншым. — Сябры Беларускага Студэнскага Саюзу ў сьпешным тэмпе — ў складчыну — сабралі грошы, закупілі вянок і выдэлегавалі на паховіны Нябожчыка 2-х сваіх сяброў: віцэ-старшыню Б. С. С. — кал. Войтэньку і сяброўку В. Чатырчанку, якія выехалі з Вільні 5-га с. г.

„Гаспадарчыя і моральныя здабычы коопэрацыі" — гэта тэма рэфэрату, які з прычыны „Месяца беларускай коопэрацыі" ладзіць Віленскі Аддзел Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры ў сераду дня 13 сьнежня с. г. ўва ўласнай залі (Завальная 1—1). Рэфэрат чытаціме рэдактар „Самапомачы" інж. А. Клімовіч.

Тэма рэфэрату вельмі актуальная і трэба спадзявацца, што спасярод віленскіх беларусоў знойдзе адпаведнае зацікаўленьне і зразуменьне. Пачатак рэфэрату роўна а гадз. 18-ай. Уваход вольны.

Паседжаньне Прав. Камісіі пры Б.Н.К. 27 лістапада с. г. адбылося чароднае паседжаньне Праваслаўнай Камісіі, на каторым былі прыняты ў Камісію новыя сябры: грам. грам. Аркадзь Махонька, Юры Кепель і Пётра Радзюк. На паседжаньні гэным быў выбраны Прэзыдыюм Камісіі ў складзе: старшыня:—С. Сарока, віцэ старшыня М. Шчорс і сэкрэтар П. Радзюк. Пастаноўлена таксама зьвярнуцца ў найбліжэйшым часе да Выш. Дух. Уладаў у справе беларусізацыі Царквы, выдаць да вернікаў Прав. Царквы ў Зах. Беларусі адпаведную адозву. Затым было сьцьверджана выбыцьцё з Камісіі грам. Багдановіча.

Суд над былымі вучнямі. Дня 29-га лістапада с. г. адбыўся ў Акружным Судзе ў Вільні працэс супроць б. вучняў зьліквідаванай у мінулым годзе Беларускае Вучыцельскае Сэмінарыі ім. Фр. Багушэвіча ў Вільні. На лаве аскаржаных заселі б. вучні: Фр. Шутовіч, Крупіч, Трахімавічанка, Аляшкевіч. Закідалася ім камуністычная дзейнасьць, за якую мелі адказываць з 102 артыкулу Карнага Кодэксу з 1903 г.

Суд па разглядзе справы вымененых вышэй вучняў апраўдаў.

Трэба зазначыць, што некаторыя з гэтых вучняў перад судовай над імі расправай прасядзелі ў вастрозе да 6-х месяцаў, пакуль ня зводьнена з вастрогу за каўцыю, далей—што гэтыя вучні больш году змарнавалі, ня вучачыся у школах, бо ж ніякая школа іх—будучых падсуднымі—ня прыймала.

Хто-ж дзеля гэтага верне ім маральныя і матэрыяльныя страты?!

Сход сяброў студэнскага Т-ва Беларусаведы пры У.С.Б. у Вільні адбудзецца ў нядзелю, дня 10.XII.33 у галоўным будынку ўнівэрстытэту (саля 7-я) а гадз. 11-й. У парадку дзенным сходу — справаздача з дзейнасьці і выбары новых уладаў Т-ва.

Канцэрт славянскай песьні. Бацькаўскі Камітэт Беларускае Філіі Дзяржаўнае Гімназіі ім. Ю. Славацкага ў Вільні ладзіць дня 10.XII.33 (нядзеля) на карысьць незаможных вучняў гімназіі **Канцэрт славянскае песьні.** Канцэрт адбудзецца у залі гімназіі, Вострабрамская вул. № 9.

Праграма канцэрту: 1) Беларускі Хор пад кіраўніцтвам Г. Шырмы выканае творы: А. Грэчанінава, К. Галкоўскага, П. Машыньскага. Ст. Казуры, Г. Давідоўскага, М. Равенскага, М. Рэчкунова, Л. Рагоўскага і інш. у беларускай, польскай, украінскай і расейскай мовах;

2) Струнны аркестр пад кіраўніцтвам Л. Фёдарава.

Пачатак у 7 гадз. 30 мін. веч. Уваход па білетах ад 1 да 2 зл.

„Новы Шлях". Пад такім загалоўкам выйшаў 25.XI.33 г. у Вільні нумар першы органу беларускае нацыянальна-сацыялістычнае думкі. Рэдактарам-выдаўцом—Уладыслаў Казлоўскі. Зьмест гэтага нумару прысьвячаны праграмовым справам.

Зазначаем, што рэдактар Казлоўскі насупроць цьверджаньня беларускіх палёнофілаў і саветафілаў — ня ёсьць сябрам БХД.

Выйшаў „Беларускі Народна-Гаспадарскі Календар" (кніжка) на 1934 г. Старонкаў 110. Мае багаты аддзел гаспадарскі й літэратурны. Цана 60 грашоў. Прадаўцом уступка. Галоўны склад: Вільня, Зарэчная 14—7.

Keturakis.

Ameryka ŭ łaźni. 7)

Kamedyja ŭ troch dziejach.

Z litoŭskaj mowy pierakłaŭ

St. Marcinkiewič.

(Praciah. hl. „Bieł. Krynicu" Nr. 43).

Wincuk. Wiedama: pa pradažy i baryšy.

Harbuz. Aha, praŭdu ty kažaš (*wychodzie*).

Wincuk (*idzie ŭ kamorku, ale ŭ dźwiaroch spatykaje Agatu*). Nu jak, ci pałažyŭ?

Agata. Pałažyŭ, ale zamknuŭ na klučl...

Wincuk. I što ciapier budziem rabić? chiba razłamać skrynku!...

Agata. Bajusia!.. Aha — mamy kluč ad šafy dachodzić; mama zaŭsiody adčyniaje baćkawu skrynku, jak čaho patrabuje. Dobra, što prypomniła... (*hladzić na šafu praz dźwiery da sieniaŭ, wybiahaje, prynosić kluč i padaje Wincuku*). Wo jon i jość.

Wincuk. Nu, sprabujem adčynić!

Agata. Tolki-ž barani Boža, kab chto nie ŭwajšoŭ!...

Wincuk. Nichto nia ŭwojdzie; što my, tut zamarudzim?... Tolki skarej! (*uwachodziać u kamorku, adkul čuwać hałasy*). Katoraja skrynka — heta?

Agata. Heta.

Wincuk. Wot i jość! (*Agata dryžačymi rukami adčyniaje skrynku. Wincuk prysieŭšy hladzić*).

Agata (*adčyniŭšy*). Wo! Hawaryła, što pałažyŭ! (*biare hrošy*).

Wincuk. Paličy: ci stolki, skolki kazaŭ?

Agata. (*liča*) A jak-ža: dźwie sotni...

Wincuk. A što, ci ja nie kazaŭ! daj pahladžu...

Agata. (*daje hrošy*) Hladzi tolki, kab chto nie ŭwajšoŭ!

Wincuk. Ot čaławiek, za hetyja papierki swaio rodnaje dzicia pradaje! To treba serca mieć...

Agata. Wincučok mileńki, skarej!

Wincuk (*daje hrošy*). Na, schawaj dzieniebudź.

Agata (*zadumana*). Što mnie ciapier rabić!.. Sama nia wiedaju.

Wincuk. Dyj čaho jašče dumaješ? Chawaj i kaniec! Ci ty nia čuła, što jon kazaŭ! Paśla času nia budzie. Kažu biary! Za čyju skuru hetyja hrošy?...(*choča ŭziać ad Agaty, ale jana chawaje ich za pazuchu*).

Agata. Nu, što budzie, to budzie...

Wincuk. Skarej začyni—i jak kamień u wadu.

Agata. (*zamykaje*). Tolki, hdzie ja ich padzienu?...

Wincuk. Sapraŭdy: hdzie ty ich pałožyš?.. Jašče, barani Boža, hdzie zhubiš.

Agata. Wot-ža heta-ž i jošć!

Wincuk. Nia wiedaju sam, hdzie ty ich schawaješ. Moža chto nadyjšci.. A ci ty wiedaješ, Agatka? Daj ty mnie ich, to chacia budzieš spakajniejšaja...

Agata. (*pryciskaje k sabie hrošy niedawierčywa*) Aha! Paśla ty možaš nie addać...

Wincuk. E-e! To ty hetak, Agatka! To ty mnie nia wieryš! Kali tak, to ničoha nia budzie: pałažy hrošy, hdzie byli i pojdziem chto sabie. Čakaj sabie henaha (*choča iści*).

Agata (*trymajučy Wincuka*). Wincučok! Ja-ž tabie wieru, mnie tolki tak niejak strašna... Užo ja i sama nia wiedaju, što rabić...

Wincuk. Pušci Agatka! Što mnie tut.., tabie widać heny lepšy; wialikaja reč, kali i nia raz moža wyłupić; a mnie, widać, treba ŭstupić: što-ž zrobiš, hetkaje majo ščaście!

Agata. (*abymajučy Wincuka*) Wincučok! Daražeńki!...

Wincuk. Pušci, Agatka! Što z hetaha? Ja ciabie ščyra chacieŭ ratawać, ale kali ty mnie tak nia wieryš, to niama čaho. .

Agata. Wincučok, kałasok!

Wincuk. Pušci! Kažu, ničoha nia budzie..

Agata. To ŭžo i zahniewaŭsia... Wincučok: ja tabie i wieru i ŭsio, tolki mnie tak strašna: kali ty, Wincučok, barani Boža, z hrašami...

Wincuk. (*milej*) Agatka! Pałažy ty hetyja hrošy, nia bojsia; ja ich nie waźmu, choć-by ty mnie ich addawała! Wiedaješ, Agatka, ja nikoli nie spadziawaŭsia, što ty mnie nie dawiaraješ. Agatka ty maja darahaja! Kab ty wiedała, jak mnie ciabie škada, i jak tolki ja prypomniu, što hetkamu dastanieśsia...

Agata. (*rašuča*) Na, užo biary!... Ale hladzi, Wincučok! (*daje jamu hrošy*).

Wincuk. Užo ja i sam nia wiedaju: moža jašče jon tabie spadabajecca, to našto ja was budu razłučać... a tymbolš, što mnie jašče nia wieryš.

Agata. (*kidajučy Wincuku hrošy*). Biary ŭžo Wincučok, biary! Nie źwiartaj uwahi, što ja kazała... Wincučok, jaki ty dobry! Ty zaŭsiody byŭ dobry! (*abymaje*). Tolki ŭžo, Wincučok, hladzi, na ciabie adnaho tolki spadziajúsia! U tabie tolki baču metu swajho žyćcia!

Wincuk (*kładzie hrošy ŭ kišaniu*). Ciapier, Agatka, to ty nikoha nia bojsia: sa mnoj ty nihdzie nie prapadzieš.

Agata. Kab tolki Božańka daŭ—dobra ŭsio pašło!

Wincuk. Nia bojsia: ja wiedaju, što rablu.,.

Agata. Dyk kali-ž ciapier my?...

Wincuk. Kali? Siańnia ŭ načy, jak usie pasnuć; čakać nie wypadaje — ahledziacca, što

З эканамічнага жыцьця ў Незалежнай Літве.

Месяц прапаганды свайго промыслу. Перад паўстаньнем Незалежнай Літвы, літоўскі промысл быў цалком нязначны. Большасьць фабрычных тавараў трэба было даставаць з заграніцы. З бегам часу жыцьцё палепшала і пачаў расьці свой промысл. Аднак грамадзянства, прывыкшы да заграничных тавараў, на свае глядзела крыва і ахватней купляла заграничныя, хоць і значна даражэйшыя.

Тымчасам літоўскі промысл так разьвіўся і ўдасканаліўся, што тавары ўласныя ўжо нічым ня розьніліся ад заграничных, трэба было толькі заахвоціць грамадзянства купляць іх.

З гэтай мэтай, пара гадоў таму, у Літве быў наладжаны месяц прапаганды сваіх тавараў. Месяц гэты даў прыгожыя вынікі. Цяпер паўстала думка наладзіць яшчэ падобны месяц, які адбудзецца ў будучым годзе. Будзе тады грамадзянства заклікацца, каб карыстала з тавараў вырабу літоўскіх фабрыкаў.

Бойні і халадзільні. Ужо мінула пяць гадоў, як у Клайпэдзе пачала працаваць вялікая фабрыка-бойня, збудаваная коштам літоўскай дзяржавы. У гэтай бойні найбольш прыгатаўляюцца бэконы для Англіі. Халадзільні абрабляюць масла, яйкі і мяса так-жа для вывазу заграніцу. Клайпэдзкая бойня, якая завецца „Літоўскі Экспорт", каштавала 6 мільёнаў літаў. З пяці фабрык бэконаў толькі Ковенская большая за Клайпэдзкую, а ў Шаўлях, Таўрогах і ў Панявежы меншыя За пяць гадоў Клайпэдзкая фабрыка-бойня закупіла і абрабіла на бэконы да 600.000 сьвіней, за якія сялянам выплаціла 65 мільёнаў літаў. Праз халадзільні перайшло заграніцу да 750,000 бочак масла.

Зямельныя падаткі. Агульная плошча зямлі (апрача краю Клайпэды) у Нез. Літве займае 55,660 кв. кілёмэтраў, або 5,556.000 гэктараў. Клайпэдзкі край мае толькі 2420 кв. клм. Жыхары гэтага краю свайму ўраду плацяць даволі высокія падаткі. Падаткі-ж з усіх іншых зямель Незал. Літвы ідуць у дзяржаўны літоўскі скарб. З гэтых зямель за год зьбіраецца падаткаў да 17 мільёнаў літаў. Падаткі там бяруцца паводле гатунку зямлі. За гэктар зямлі I катэгорыі — 9 літаў у год (літ — дзесятая часьць даляра), за II-гі—7,50, за III ці — 5 і за IV-ты — 1,50 літ. Гэткія падаткі ўстаноўленыя некульні гадоў таму абавязваюць сяньня. Як бачым, падаткі гэтыя зусім малыя, аднак калі дзякуючы крызысу цэны на сялянскія прадукты цалком упалі, сялянам і гэтыя малыя падаткі плаціць цяжка. Дзеля гэтага цяпер робяцца захады, каб падаткі на зямлю яшчэ абнізіць.

З „Musu Artojus"
пераклаў М. К.

З Польшчы.

Масавыя арышты камуністаў. У Варшаве паліцыя вядзе акцыю ліквідацыі камуністычнай арганізацыі. У сувязі з гэтым арыштавана каля 55 асоб.

Сойм, пасьля 30-ці днёвага перарыву адбыў 7-га г. м. паседжаньне, на якім разглядаў у першым чытаньні ўрадавыя праекты законаў.

„Нацыянальная пазыка," якую нядаўна расьпісаў урад, налічае ўва ўсей Польшчы 337,641,600 зл. На пазыку падпісалася 5 проц. насельніцтва: на гарадзкое насельніцтва прыпадае 96,1 проц. агульнае сумы, на вясковае —3,9 проц. Гэтыя цыфры дастатачна паказваюць, хто больш грашэй мае, хто багацейшы. А калі прыймем пад увагу, што вясковае насельніцтва ў значным процанце перавышае лік жыхароў гарадоў (на 100 жыхароў каля 70 вяскоўцаў, рэшта — жыхары места), то ўбоства вёскі яшчэ станецца ярчэйшым.

Цана доляра. На варшаўскай неафіцыяльнай біржы у мінулым тыдні за адзін папяровы даляр плацілі 5 зл. 63 гр., за адзін залаты рубель—4 зл. 69—74 гр.

З заграніцы.

Саветы і Амэрыка. Бальшавіцкі камісар заграничных спраў Літвінаў, з увагі на слабасьць бальшавіцкае дзяржавы і дзеля ейнага страху перад буржуазнымі дзяржавамі, заключыў ад імя сваей дзяржавы ўжо многа т. зв. пактаў аб ненападаньні, прадусім з суседнімі капіталістычнымі дзяржавамі. Зрабіўшы гэта, паплыў рабіць „інтэрас" за мора. Нядаўна быў у Злучаных Дзяржавах Амэрыкі, гдзе ўдалося яму заключыць з прэзыдэнтам Рузвэльтам дагавор аб праўным прызнаньні Амэрыкай Савецкага Саюзу. У дагаворы савецкая дзяржава, паміж іншым, прызнала прынцып рэлігійнай свабоды, аднак— толькі для амэрыканцаў, пражываючых у граніцах савецкае дзяржавы. Гэтая рэлігійная свабода тое значыць, што амэрыканцам, пражываючым у Саветах, можна свабодна выконываць усякія рэлігійныя абрады, будаваць цэрквы-касьцёлы, заключаць царкоўныя шлюбы, хрысьціць дзяцей і г. д.

Ня ведама, як будзе ў практыцы з гэткай гваранцыяй рэлігійнай свабоды ў саветах. Бальшавікі умеюць гарантаваць розныя свабоды на славах, але не на дзеле.

Аб гэтым найлепш ведаюць беларусы. Шмат Беларусоў праз бальшавіцкія гваранцыі цяпер пакутуе. Але тут справа з Амэрыканцамі, як ніяк — сілай!

Савецкім паслом у Амэрыку назначаны Траяноўскі, а амэрыканскім у Саветах — Бульвіт. Літвінаў з Амэрыкі дамоў едзе праз Італію і Нямеччыну.

У Францыі частыя зьмены ўрадаў выклікалі вялікае незадаваленьня, а фэдэрацыя саюзаў комбатантаў (учасьнікаў вайны) прасьцерагла французскі парлямэнтарны сьвет, што калі наступны ўрад, які-б ён ня быў, быў змушаны перад ухваленьнем бюджэту і іншых спраў падацца ў адстаўку, дык паўстаўшая над краем небясьпека выкліча крызыс дзяржаўнага ладу, за які адказнасьць перад французскім народам спадзе на парляманцкі сьвет. Як бачым, Францыя перажывае паважныя мамэнты.

У Гішпаніі афіцыяльна устаноўлены гэткія вынікі выбараў у кортэзы (парлямэнт): правіца — 207 мандат, цэнтр—167, левіца — 99 (у гэтым толькі 58 соцыялістых). Гэта няўдача соцыялістаў тлумачыцца тым, што як былі дабраўшыся да ўлады ў папярэднім парлямэнце груба ўжылі свае ўлады у адносінах да рэлігійных пачуцьцяў свайго народу. З увагі на магчымасьць соцыялістычных забурэньняў прэзыдэнт гішпанскай рэспублікі абвесьціў т. зв. стан узмоцненай абароны дзяржавы, а ўрад у адозве да народу загварантаваў у краі супакой.

У Фінляндыі дня 6-га с. г. адбылося ўрачыстае сьвяткаваньне гадаўшчыны абвешчаньня незалежнай рэспублікі.

З краю.

Судзілі сялян. Нядаўна Акружны Суд ў Баранавічах разглядаў справу сялян в. Жарабковічы, аскаржаных за пяяньне „камуністычных песень" і засудзіў па аднаму гаду: Аляксея Рамановіча, Міхася Зянюка, Міхася Войтуля, Аляксея Таранду, Міхася Яруца, Марыю Каляду і Ждановіча.

---

niama hrošy. Wiečaram siahońnia skažy baćkom, što zaŭtra maješsia kudy niebudź iści, dy tak chutka nie ahledziacca. U nočy wyjdziem, ty dzie niebudź pačakaješ, a ja tymčasam pastarajusia kania...

A g a t a. Dyk jak-ža, Wincučok, kudy-ž mnie ciapier iści?..(*čuwać niechta idzie—pierapałochana*) Niechta idzie!..

W i n c u k. Wyjdziem adhetul! Kluč pakiń. Skarej! Jašče paśla paradzimsia.

A g a t a (*wyciahwaje kluč*). Užo-užo, Wincučok...

Z a s ł o n a.

DZIEJA III.

(Nazaŭtra ŭ Harbuzowaj chacie; chata nia mieciena, abstanoŭka biednaja, u chacie dwa wakny, widać dźwiery ŭ sieni, kala ścien ławy, u kucie stoł; pry dźwiarach pieč. Harbuz łataje siarmiahu, pastušok na ławie struhaje da młynka kryło).

H a r b u z i c h a (*uwachodziačy*). Užo ŭznoŭ niekudy licha pahonie: jeździć biez kanca, niawiedama pašto i kudy.

H a r b u z. Kali mnie treba, to i pajedu: jaje tut reč...

H a r b u z i c h a. Tabie tolki adnamu treba, tej žmieni kminu nie mahu sabracca zawieści. Kali ŭ miastečka pajedzieš, to kažy—i ja budu źbiracca?..

H a r b u z. Wiedama: adchinisia kudy, to i jana za taboj paciahniecca... Patrebnaja, jak sabaku piataja naha.

H a r b u z i c h a. Wot widziš: tolki jon wiečna patreby maje, a druhomu to ničahusieńki nia treba... Dyk kažy — u miastečka pajedzieš?

H a r b u z. U miesta, u miesta; widžu—ad ciabie nia adčepišsia... Ale hdzie-ž naša Agata, što ja jaje cely dzień nia widžu?

H a r b u z i c h a. Da Bazylowych... jašče ŭčora z wiečara źbirałasia; kazała, što maje tam wialikuju patrebu, widać rana i wyšła.

H a r b u z. Ci ž nie mahła kali ŭ światy dzień pajści: byccam raboty ŭ chacie niama... A Wincuk kudy wyjšaŭ?

H a r b u z i c h a. Da Sapuna maniŭsia iści pa nožnicy.. kazaŭ, što niejkija tam lepšyja pakinuŭ... Ale pabiahu-ž ja na haru pa kmin (*wychodzie*).

H a r b u z (*porycca kala siarmiahi, a paśla hladzić praz wakno*). Chto ž tut ciapier taki pryjechaŭ?... Sapraŭdy, jak byccam Antoś!..Jon, zapraŭdy jon! U dwuch...

Jaki-ž čort ciapier ich tut prynios! To ŭžo i hety pačnieć pa piatach taptacca. Nu, čas wybraŭ, kali mnie tudy treba śpiašacca, moža-b paśpieŭ kamornika jašče strymać, a ciapier ad hetaha, jak ad smały nie, adčepišsia. Ach, kab ty prapaŭ, kab ty... Zdochnieš ty, pokul mianie znajdzieś, (*da pastuška*) Janučok! siudy pryduć henyja ludzi — skažaš, što mianie niama ŭ chacie; kažy — pajechaŭ. Tolki-ž hladzi (*Sam sabie*) Skarej sprucianieješ, čymsia mianie znajdzieš (*lezie na pieč i chawajecca za kominam, zaraz uwachodzie Antoś z swatam; ahladajecca i dziwicca*).

A n t o ś i S w a t. Pachwalony Jezus...

P a s t u š o k. Na wieki...

A n t o ś (*da swata*). Što za licha, moža my nia tudy trapili?

S w a t. Jak-ža nie, kali my ŭ dwuch pytali i abadwa pakazali siudy, — tut, nia jnačaj.

A n t o ś. Nia moža być!

S w a t. Wot papytajem u hetaha chłapca (*da pastuška*). Chłapiec, skažy ty nam, chto tut žywie, čyj heta dom?

P a s t u š o k. Harbuz žywie.

S w a t. A Agata, dačka jaho, ci tut?

P a s t u š o k. Tut.

S w a t. (*Antosiu*) Nu widziš, ja kazaŭ, što tut.

A n t o ś. Nia moža być: Ci-ž by Wincuk hetak nabrachaŭ! Tut-ža saŭsim žabrackaja chata, chleŭ niejki! Sam-ža hladzi: jaki tut dom, jakija płaty, usio... Ci nam chto čmut u wočy puściŭ. Až mianie strach biare... (*hladzić praz wakno, razhladajecca pa chacie i paciskaje plačami*).

S w a t (*da pastuška*). To kažaš — haspadar pajechaŭ?

P a s t u š o k. Niaŭžo-ž nie, sapraŭdy pajechaŭ

F a j b č y k (*uwachodzić*). Dzień dobhy.

S w a t i A n t o ś. Dobry dzień.

F a j b č y k. A sto wi chłopcy tak zdalok pryjechali?

S w a t. Tak sabie, tut siakija takija majem sprawy.

F a j b č y k. Dziaŭcat sukajecie? Nie, sto Antoś: u ciabie hrosy jak wady, idzi da Harbuza ziaciam; Agata piekny i tłusty dziaŭcyna. Tolki znaješ, bhatka Antoś, nie pazalej ty jamu zhary nieskalki sot.

S w a t. To kažaš tut žywie Harbuz Jazep?

F a j b č y k. Jazep Harbuz tut žywie; niu heta jaho chata, a što?

S w a t. Kali-ž nam kazali, što tut taki dom, budynki, wakolica, što druhich pašukać, a ciapier, jak sami bačym, to praŭdziwaja pustynia: ŭsio pałamana, pierawierniena.. Nu, a druhoha takoha tut ci niama? Moža my nia tudy papali?

F a j b č y k. Uj! dobha papali! Gut papali: druhoha hetkoha dobraha čaławieka niama i na ŭsiej ziamla nie znajdzieš. Ci wi tut pieršy has?

S w a t. Woś-ža heta, što pieršy.

(d. b.)

Да нас пішуць.

Выбарчыя „красачкі“.

Алькотвічы, Вялейскага пав. І тутака, як і ў другіх мясцох нашае воласьці, адбываліся выбары раднікаў і іх заступнікаў у рады Грамадаў. Хаця сяляне нешта і чулі аб маючыхся быць выбарах, але да апошняга дня ня ведалі ані аб парадку выбараў, ані аб правах, якія выбаршчыкам паводле выбарчага закону належыліся. Словам, рабілася так, каб сяляне да апошняга дня ні аб чым ня ведалі. Тыя ж, у інтарэсах якіх трэба было скрываць і не даваць да ведама шырокіх кругоў, ня спалі, — як кажуць, — у шапку, бо цішком і загадзя прыгатаўлялі лісты кандыдатаў, сабіраючы подпісы сярод няўсьведамленых сялян, пераважна старыкоў. І калі 13.XI. зьявіліся сяляне на выбары ў вёску Аўсянікі, каб выбраць раднікаў у Кабылянскую Грамаду, кіраўнік выбарчае камісіі, паляк, вучыцель Кабылянскае школы, адчытаўшы адносныя парафграфы выбарчага рэгуляміну і прыняўшы ад б. вучыцеля, таксама паляка, загадзя прыгатаваныя лісты кандыдатаў і іх заступнікаў, зараз-жа аб'явіў сабраўшымся выбаршчыкам, што далейшая падача кандыдатаў „została zamknięta“ і што выбарчая камісія ўважае за выбраных тыя асобы, якія фігуруюць у пададзеных лістах б. вучыцелем Баднарчыкам. Калі-ж гр. Антон Аўсянік хацеў вусна падаць кандыдатаў да пратаколу ад імя сабраўшыхся выбаршчыкаў, кіраўнік выбарамі Свора катэгарычна спрацівіўся гэтаму; забараніў нават выбаршчыкам задаваць пытаньні. „Milczeć i nierozmawiać!“ — крычаў гэты пан на выбаршчыкаў, а пару старыкоў, якія прабавалі галасна пратэставаць, прыказаў прысутнаму паліцыянту вывесьці за дзьверы.

Абураныя выбаршчыкі. у тым ліку і адзін з сяброў выбарчае камісіі і большасьць запісаных на пададзеных лістах кандыдатаў і іх заступнікаў, уцягнутых на лісты бяз іх ведама, сабраўшы назаўтра 145 подпісаў, зляжылі на імя кіраўніка валаснае камісіі ў Іліі пратэст, дамагаючыся скасаваньня „выбараў“, адбыўшыхся 13.XI. у в. Аўсяніках, і вызначэньня новых выбараў радных і іх заступнікаў у Кабылянскую грамаду.

Трэба ведаць, што прадстаўленыя лісты б. вучыцелям, на якіх між іншым фігуруюць на першым месцы ён і на другім — ягоная жонка, састаўлена ў дужа арыгінальны спосаб, дасюль бадай нідзе непрактыкаваны, бо ў рубрыках друкаваных блянкетаў, на якіх значыцца імя, імя бацькі, прозьвішча, гады і дзе жыве кандыдат, сьпярша выпісаны былі адны асобы, а пасьля — дзеля прычын ведамых толькі б. вучыцелю Баднарчыку і ягоным кумпанам — некаторыя з гэтых кандыдатаў і іх заступнікаў пазаклееваны паперкамі, на якіх ужо фігуруюць асобы другія. Выходзіць так, калі — скажам — Іван падпісаўся за фігуруючага ў лісьце Антона, дык пасьля гэтага Антона заклеена паперкай, на якой ужо выпісалі Андрэя, за якога Іван сваей подпісі не даваў і мо' ніколі ня даў-бы.

Аб гэтым — мякка гаворачы — „uchybieńni“ зазначана ў пратэсьце, як зазначана паміж іншым і аб тым, што супроць выбаршчаму праву не пазволена гр. Антону Аўсяніку вусна западаць кандыдатаў да пратаколу.

Але гэта йшчэ ня ўсё. На другі дзень пасьля падачы пратэсту, алькоўская паліцыя пачала рабіць „dochodzenia“ у в. в. Кабыльлі і Аўсяніках, якую хіба нехта, — а хто, дадумацца лёгка, — паведаміў аб „нелегальных“ сходках, на якіх сабіраліся дзеля пратэсту подпісі. „Пастрашыўшы“ выбаршчыкаў, пайшлі ні з чым паліцыянты дамоў. Цяперака-ж страшаць тут, а хто — таксама лёгка дадумацца, — што падпісаўшыхся чакае кара, асабліва-ж напісаўшага пратэст гр. Антона Аўсяніка. Мо' і спалохалася якая жанчына, але сьведамых сваіх правоў выбашчыкаў не спалохаюць.

Нам пакульшто няведама, што станецца з нашым пратэстам, але мы пакульшто свой грамадзкі абавязак споўнілі і няхай аўтары „клеяных“ лістоў ведаюць, што Кабылянскае грамадзе з імі не падарозе.

Аб выніках нашага выбарчага пратэсту паведамім асобна. **Выбаршчык.**

Выбары дэлегата на Епархіяльны Зьезд.

Докшыцы, Дзісьненскага пав. 1 сьнежня г. г. адбылісяў Докшыцах выбары дэлегата на Епархіяльны Зьезд у Вільню. Выбары гэтыя былі зроблены па загаду о. Докшыцкага благачыннага, прат. Мікалая Пляшчынскага. На сабраньні былі прысутнымі айцы настаяцелі прыходаў, псаломшчыкі і царкоўныя старасты. На гэтым благачыньніцкім сабраньні было разважана наступнае: 1) сьвяш. К. Дэрынг парушыў пытаньне аб вялікім штаце служачых Віленскай Кансысторыі і дамагаўся зьмяншэньня Кансысторскага бюджэту, праз што і падаткі царкоўныя зьменшыліся-б; 2) Айцы прыходаў ставілі пытаньні аб скасаваньні падатку на Духоўную Сэмінарыю, каторая дастаець запамогу ад казны; 3) Парушана было пытаньне прасіць духоўную уладу аб выданьні танных падручнікаў Закона Божага на беларускай мове. Цікава, што з гэтага ўсяго выйдзе? Бо адразу на гэтым-жа сабраньні вырашылася адно пытаньне! Айцец К. Дэрынг, настаяцель Порпліскай царквы, выразіўся процiў выданьня Закона Божага на беларускай мове, бо сказаў, што мова беларуская ёсьць „хамскай,“ а як сталі прысутныя з яго прамовы дзівіца, дык ён пацьвердзіў, што язык і гутарка беларуская ёсьць „базарныя“. Як аўтор гэтае корэспондэнцыі, так і прыхаджане Порпліскай царквы, добра ведаюць, што а. К. Дэрынг радзіўся не ў Маскве, а ў Паставах і ведаюць, з якога ён вышаў роду. Цікава, чаму а. Дэрынг „выпаліў“ з сваёй „белагвардзейскай галавы“ ганьбячыя беларускую мову словы, у той час, калі сяньня ён жывець на „хамскім“, на „базарным“ хлебе і дзякуючы гэтаму вучыць дзьвух дачок у Вільні, купіў ім раяль за 2.000 злотых ды і сам выглядае нядрэнна. Але да пары збан ваду носіць! Уканцы сабраньня, па загаду а. Благачыннага прыступілі да выбару дэлегата. Выбраны дэлегатам, наперакор жаданьню кар'ерыстага а. Дэрынга, прат. Міхеіл Варфаламееў, настаяцель Тумілавіцкай царквы, чалавек паважны, пажылы і усімі паважаны, што зрабіла вялікае задаваленьне сярод тых, каторым лёс Праваслаўнай царквы ў Польшчы дарагі.

У нашай Докшыцкай вакрузе бязбожнікаў ня чуваць, а гэта дзякуючы ўмеламу жыцьцю і працы айца пратаіерэя М. Пляшчынскага, Докшыцкага благачыннага каторы цешыцца вялікай сымпатыяй сярод праваслаўных і іннаверцаў яго вокругу і ня дай Бог яго ня стане, а пападуць у благачынныя гэткія, як а. Дэрынг, то наперад можна сказаць, што ў нас—жыцьця ня будзе. Аб жыцьці беларускім на прыходах—пагаворым другім разам. **Б. Дудка.**

Дробныя весткі.

— У Кітаі нядаўна адбылося сьвяткаваньне тысячалетняга юбілею часопісі п. з. „Peking Gazette.“ Памі-ж іншым у юбілейным нумары была зьмешчана статыстыка—падлічэньне рэдактароў, пакараных за розныя праступкі на працягу 1000 гадоў карай сьмерці. Такіх рэдактароў налічана 1797.

— З Расеі паведамляюць, што ў Сібіры насталі вялікія маразы. Тэмпэратура дасягае 35 градусаў ніжэй нуля. З увагі на неспадзяваную зьмену тэмпэратуры, многа ёсьць выпадкаў сьмерці ад марозу, асабліва сярод работнікаў, пражываючых у дзераўляных бараках.

— У Варшаву прыехаў з Масквы прадстаўнік савецкіх магазынаў „Торгсін“ дзеля ўрэгуляваньня спраў, зьвязаных з закупамі тавараў для савецкіх унівэрсальных магазынаў.

З Вільні.

Прысуд. Віленскі Апэляцыйны Суд засудзіў грам. Івана Крыўку, беларуса (з Новай Вілейкі), на 11 месяцаў і 800 зл. штрафу за закіды маральнага характару і абразьлівыя словы, — якіх Крыўка ужываў у адной з польскіх часопісяў па адрасу б. дырэктара Т-ва Арганізацыяў і Кулак Рольнічых у Вільні Ч. Макоўскага (брата б. польскага міністра судоў). Грам. Крыўка, як даказывалі ягоныя абаронцы, ў сваіх выступленьнях кіраваўся грамадзкай карысьцяй і быў пераканаыны ў іх слушнасьці.

Пісьмо ў Рэдакцыю.

Паважаны грам. Рэдактар!

У Вашай паважанай газэце „Бел. Крыніца“, № 43 з дня 27 лістапада г. г., зьмешчана была зацемка аб выхадзе маім з Таварыства Беларускай Асьветы, пры чым паданы зусім нязгодныя з праўдай прычыны майго выхаду. Таму, у імя праўды, прашу грам. Рэдактара зьмясьціць наступнае:

Сапраўды з Таварыства Беларускай Асьветы я выступіў, аб чым 17.XI г. г. зляжыў заяву на імя Старшыні Т.Б.А. грам. Караля. Прычынай майго выступленьня з гэтай арганізацыі зьяўляецца: 1) што Т.Б.А., як гавора сам назоў, павінна быць арганізацыяй беларускай і таму немагчыма, каб працу вялі небеларусы. Да такіх належыць грам. Самойло, каторы афіцыяльна выракаўся беларускай справы, 2) што грам. Самойло выкідае заслужаных беларускіх грамадзян з памешканьня Т.Б.А., уважаючы гэтае памешканьне за сваё ўласнае, 3) ня гледзячы на дэструкцыйную працу гр-на Самойло, яго падтрымліваюць грам. грам. Луцкевіч і Трэпка; гэтая-ж дружба грам. грам. Луцкевіча і Трэпкі з Самойло, а таксама і кіруючая роль грам. Самойлы ў Т.Б.А. пазваляе прыпушчаць, што гэта арганізацыя выкарыстаеецца для мэтаў нічога супольнага ня маючых з беларускай грамадзкай працай.

Антыграмадзкая і шкодная праца грам. грам. Луцкевіча і Трэпкі ў Т.Б.А., узалежніваньне ад сябе матэр'яльна гэтай арганізацыі, а так-жа ўтрымліваньне чужых і варожых беларускай справе людзей у самой арганізацыі — вось сапраўдныя прычыны, якія прымусілі мяне выступіць з Таварыства Беларускай Асьветы.

З пашанай

Кузьма Крук

4.XII.1933 г. Раднік м. Вільні.

Прыпіска Рэдакцыі. У імя грамадзкай бесстароннасьці даём грам. К. Круку магчымасьць выказацца. Аднак ня верыцца нам, каб разыходжаньне яго з бел. санацыяй было прынцыповым. Уважаем, што грам. Крук, далей астаючыся санатарам, ад Луцкевічаўскай санацыі ўцякае, бо бачыць, што там нічога грамадзкага ня робіцца, а грошы, якія Луцкевічу і кумпаніі даюцца на працу, проста праядаюцца. Для грам. Крука ясна, што гэткая „праца“ мусіць хутка спыніцца і што трэба імкнуцца да абнаўленьня санацыі. Чытаючы пісьмо грам. Крука проста рэжа вочы факт, што ў пісьме гэным ані слоўцам не ўспамінаецца аб Р. Астроўскім, які пасьля Луцкевіча зьяўляецца галоўным санацыйным махерам, а так-жа ані слоўцам у гэтым пісьме не ўспамінаецца аб апошніх брудных падзеях, зьвязаных з тым-жа Астроўскім — у санацыйнай корпарацыі „Скарыніі“. Дык ці ня думае грам. Крук пры помачы Астроўскага тварыць „новую“ санацыю? Калі так, дык астаецца толькі сьцьвердзіць, што выхад грам. Крука з санацыйнай шопкі ТБА ня мае ніякага грамадзкага значэньня.

Грамадзяне! Хто жадае мець свой

Беларускі КАЛЕНДАР,

старайцеся яго купіць раней, бо з прычыны крызысу календароў друкавалася вельмі мала і потым можа не хапіць. Календары ўсюды прадаюцца на правінцыі па крамах і ўва ўсіх рыначных гандляроў па кірмашох. Для перапрадажы па гуртовай цане календары можна купляць у Навагрудку, Беластоку, Слоніме і іншых большых мястэчках. — Галоўная продаж у віленскіх беларускіх кнігарнях:

„ПАГОНЯ“, Вільня — Завальная вул. № 1—1,
Ст. СТАНКЕВІЧА—Вільня, Вострабрамская 2,
Вл. МАНКЕВІЧА—Вільня, Вострабрамская 1.

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.